■ Тры пытанні да ўлады

ЗАМЕСТ КЛУБА — НА ВУЛІЧНЫ БАСКЕТБОЛ

Якую альтэрнатыву прапануюць моладзі сталічныя ўлады

Ці нармалізавалася сітуацыя з правапарушэннямі ў начных клубах? Хто трапіць у льготныя электронныя чэргі ў паліклініках? Якія мерапрыемствы варта наведаць у летні сезон у Мінску? На гэтыя пытанні «Звяздзе» адказаў намеснік старшыні Мінгарвыканкама Ігар КАРПЕНКА.

Фота БЕЛТА.

— Ігар Васільевіч, яшчэ зімой вы выказвалі намер «навесці парадак» у сталічных начных клубах. Ці праводзяцца нейкія мерапрыемствы па гэтым пытанні?

— У пачатку года адбылася сустрэча кіраўніцтва горада і ўладальнікаў забаўляльных устаноў. Пасля яе службамі Мінгарвыканкама вядзецца сістэмная праца па дзейнасці такіх арганізацый. Планавыя праверкі начных клубаў у адпаведнасці з Указам Прэзідэнта № 510 «Аб арганізацыі кантрольнай (наглядной) дзейнасці» ў першым паўгоддзі праведзены на тэрыторыі Першамайскага раёна, а ў другім паўгоддзі запланаваны ў Цэнтральным раёне.

Працягнула працу гарадская рабочая група па кантролі за дзейнасцю начных клубаў і дыскатэк, а таксама раённыя камісіі, што кантралююць гэты від дзейнасці. Сфарміраваны пералік арганізацый, якія сістэматычна дапускаюць парушэнні ў сваёй працы (клуб «Піраты», клуб «Рэпаблік», ТАА «Зорная містэрыя», клуб «Графіці», кавярня «Лісіная нара» і іншыя). Гэтыя парушэнні датычацца і санітарна-эпідэміялагічных нормаў, і мерапрыемстваў па забеспячэнні пажарнай бяспекі, і парушэнняў заканадаўства ў гастрольна-канцэртнай сферы. Многія нядобрасумленныя ўдзельнікі гэтага спіса трапляюць у яго па выніках праведзенага маніторынгу, а таксама ў сувязі са шматлікімі скаргамі з боку насельніцтва, на якія гарадскія службы аператыўна рэагуюць.

Сёння ў названым пераліку арганізацый не больш за дзясятак назваў, і на гэтыя ўстановы, вядома, скіравана пільная ўвага гарадскіх службаў. Сфарміраваны графік маніторынгу начных клубаў сталіцы на другое паўгоддзе 2015 года. Праца па кантролі за іх дзейнасцю будзе працягнутая.

Летась у месцах масавага адпачынку моладзі (на дыскатэках, у барах, начных клубах) выяўлена 77 злачынстваў, звязаных з незаконным абарачэннем наркотыкаў, з іх 20 цяжкіх і асабліва цяжкіх. Канфіскавана больш за 370 грамаў псіхатропных рэчываў, складзена больш за 120 адміністрацыйных пратаколаў. У канцы студзеня гэтага года ў Мінску быў перакрыты канал пастаўкі псіхатропных рэчываў з Расіі, які арганізоўваў дыджэй начнога клуба «К 3». Таксама летась у начных клубах былі затрыманы трое падлеткаў.

Цяпер камітэт па адукацыі сочыць за недапушчэннем наведвання начных забаўляльных устаноў асобамі, якім не споўнілася 18 гадоў. Апроч таго, па начных клубах праводзяцца рэгулярныя рэйды, падчас якіх выяўляюцца нязначныя парушэнні правапарадку.

— Да канца года планавалася ва ўсіх сталічных паліклініках увесці сістэму электронных чэргаў. Як ідзе праца ў гэтым кірунку?

— Для кіравання чэргамі пацыентаў плануецца ўкараненне сістэм электроннай чаргі ў 48 установах аховы здароўя амбулаторна-паліклінічнага тыпу. Цяпер ужо завяршаецца працэдура выбару пастаўшчыка абсталявання.

У якасці пілотнага праекта сістэма электроннай чаргі ўстаноўлена ў новай 39-й гарадской клінічнай паліклініцы па вул. Каралінскай, 3 (мікрараён Брылевічы) у клініка-дыягнастычнай лабараторыі. Электронная чарга падзяляе патокі дарослага і дзіцячага насельніцтва, якое здае агульны аналіз крыві. Кожны паток падзяляецца на агульны і льготны. У льготны ўваходзяць ветэраны, інваліды, шматдзетныя маці, донары, цяжарныя жанчыны. Пацыенты паліклінікі перад здачай аналізу крыві выбіраюць патрэбную паслугу і атрымліваюць талон з нумарам чаргі і кабінета здачы аналізу. Нумар чаргі адлюстроўваецца на электронным табло ў пакоі чакання пацыентаў, якія здаюць кроў. Пры гэтым лабарант, які ажыццяўляе забор крыві, толькі націскае кнопку выкліку пацыента. Пацыенты льготнай катэгорыі выклікаюцца па-за чаргой.

Ужо можна сказаць, што выкарыстанне электроннай чаргі наведвальнікі паліклінікі ацэньваюць станоўча, бо гэта выключае ўзнікненне канфліктных сітуацый сярод пацыентаў, скарачае час знаходжання пацыентаў у медыцынскай установе.

— Назавіце самыя яркія імпрэзы лета, якія могуць наведаць жыхары і госці сталіцы?

— Да 13 верасня кожную суботу і нядзелю на тэрыторыі Верхняга горада выступаюць тэатральныя, харэаграфічныя калектывы, праходзяць майстар-класы і выставы дэкаратыўна-прыкладнай творчасці і выяўленчага мастацтва, выступаюць артысты вулічных тэатраў, праходзяць выставы рамеснікаў і мастакоў, паказы з удзелам клубаў гістарычнай рэканструкцыі, светлавыя перформансы, тэматычныя вечары харавой, джазавай і камернай інструментальнай музыкі.

Таксама кожную суботу летні музычна-турыстычны сезон пачынаецца гістарычнымі тэатралізаванымі паказамі ля Мінскай гарадской ратушы.

На заднім дворыку канцэртнай залы «Верхні горад» працуе танцавальная тэраса. Кожную пятніцу, суботу, нядзелю з 17.00 да 22.00 тут праходзяць танцавальныя вечары, майстар-класы, танцавальныя канцэрты.

Адміністрацыі раёнаў таксама кожную суботу з 13.00 да 18.00 рыхтуюць свае культурна-забаўляльныя праграмы, якія ўключаюць у сябе выставы, майстар-класы, выступы харэаграфічных, музычных калектываў раёнаў Мінска.

Апроч таго, па суботах у 16.00 на пляцоўцы каля Палаца спорту, дзе ўзімку заліваюць каток, праходзіць вулічны баскетбол. А 13 верасня летні сезон завершыцца гарадскім паўмарафонам.

Дзіяна СЕРАДЗЮК.
seradzyuk@zviazda.by

■ Фестывалім!

У Бабруйску сплялі вянок сяброўства

На фестывалі «Вянок дружбы-2015» можна было не толькі атрымаць асалоду ад выступлення самабытных творчых калектываў з розных краін, але і пакаштаваць «дырэктарскую» юшку, набыць эксклюзіўны сувенір і падпісацца на «Звязду».

Для газеты найперш прыемна, што кагорта нашых чытачоў хай на некалькі чалавек, але ж стала большай. Дзякуй усім тым, хто, нягледзячы на вельмі шчыльны графік мерапрыемстваў фестывалю, знайшлі хвілінку падысці да нашага століка і аддаць свой голас за родную газету на роднай мове. Спадзяёмся, што для нашых сяброў сустрэча з намі таксама стала прыемнай падзеяй. Бо ніхто не пайшоў ад нас без падарунка. Мы ж, у сваю чаргу, засталіся пад уражаннем ад гэтага цудоўнага свята народнай творчасці, якое на 4 дні захапіла ўвесь Бабруйск.

Адзін з яскравых момантаў — тэатральнае шэсце артыстаў у нацыянальных касцюмах. Рускія казакі, іспанскія кабальера, турэцкія янычары ішлі па горадзе, дэманструючы элементы сваіх нумароў.

Нельга ўявіць гэтае свята без традыцыйнага Горада майстроў. Калі сябе не кантраляваць, у яго шэрагах можна пакінуць месячны заробак. Вось і **намеснік міністра культуры Беларусі Васіль ЧЭРНІК** таксама не змог утрымацца. Прызнаўся, што набыў сабе саламяны кошык і невялічкую бочачку для лазні. Акрамя горада майстроў, ён наведаў галерэі горада і застаўся ў захапленні ад выстаўкі мінералаў. Ну і, вядома, прыйшоў у захапленне ад таго канцэрта, які адбыўся падчас адкрыцця фестывалю.

— Наогул спадабалася ўсё, — запэўніў намеснік міністра культуры. Ён, дарэчы, наведаў і столік нашага выдавецкага дома. — Гэты фестываль дружбы збірае сапраўднае сузор'е народных творчых калектываў і індывідуальных выканаўцаў. Вельмі трапятліва да свята ставіцца кіраўніцтва горада. Вялікі дзякуй усім міністэрствам і ведамствам, якія прымалі ўдзел у падрыхтоўцы фестывалю. Без іх мы б не змаглі вырашыць шэраг пытанняў. Ужо на адкрыцці было відаць, які высокі ўзровень у калектываў, якія прыслалі сюды краіны. Цікавы канцэрт, цікавая канцэпцыя адкрыцця фестывалю — гэта было 3 гадзіны падарожжаў па розных краінах і кантынентах. Тут прысутнічае не толькі Еўропа, але і Азія, Амерыка.

Прысутнасць афіцыйных дэлегацый з Расіі, Казахстана, Балгарыі, Латвіі, Славакіі, іншых краін сведчыла, што свята — не перашкода для рашэння дзелавых пытанняў. Яны паспелі не толькі наведаць шматлікія святочныя пляцоўкі, але і сустрэцца з кіраўнікамі буйных бабруйскіх прадпрыемстваў.

— Мы яшчэ не да канца раскрыліся ў сваіх узаемаадносінах, — адзначыў **сакратар Усць-Каменагорскага масліхата Аляксандр АБАКУМАЎ** падчас афіцыйнага прыёму дэлегацый у мастацкім музеі Бабруйска. — Гістарычна мы не можам адзін без аднаго. Быў час, калі кожны з нас, прэтэндуючы на арыгінальнасць, ішоў сваім шляхам. Але гісторыя так распараджаецца, каб мы зноў былі разам.

Дарэчы, сустрэцца з кіраўнікамі буйных бабруйскіх прадпрыемстваў можна было на адной з пляцовак свята, дзе яны частавалі смачнымі стравамі гараджан. Кошт быў умоўны, бо арганізатары паведамілі, што ўвесь збор пойдзе ў сацыяльныя прытулкі і дзіцячыя дамы. Таму кожны ахвяраваў, колькі мог.

— На пляцоўцы Бабруйскага жылкамгаса было прыгатавана 200 літраў юшкі і беларускага супу з бульбай. Усё з'елі. Атрыманыя сродкі будуць пералічаны ў Бабруйскі дзіцячы дом, — расказалі арганізатары дэгустацыі. — У гэтай добрай справе прынялі ўдзел дырэктары ўсіх 8 нашых структурных прадпрыемстваў. Стравы гатаваліся па рэцэптах кіраўнікоў, але расказаць іх мы вам не можам. Эксклюзіў. А тое, што ўсё з'едзена, сведчыць аб тым, што мы не дарэмна тут працавалі. Некаторыя ахвяравалі адразу 200 тысяч рублёў.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by.* **Фота аўтара**

■ Незвычайнае побач

АЎТОГРАФ ВУГЕЛЬЧЫКАМ... АЗГУРА?

Падчас рэстаўрацыі віцебскага будынка, дзе выкладалі Шагал, Малевіч ды іншыя «зорныя» творцы, знайшлі аўтограф на сцяне.

— Рабочыя здымалі верхнія слаі вось гэтай унутранай сцяны і зусім выпадкова знайшлі «графіці», зробленае вугельчыкам. Калі вы ўважліва прыгледзіцеся, таксама прачытаеце «Азгур». Гэту знаходку можна лічыць сенсацыяй. Спецыяльна, каб нехта выпадкова не сцёр нават кавалачак надпісу, мы павесілі «часовую ахоўную грамату». У тэксце гаворыцца пра адказнасць за прычыненне шкоды адпаведным каштоўнасцям, — расказвае і паказвае карэспандэнту «Звязды» **дырэктар музея «Віцебскі цэнтр сучаснага мастацтва» Андрэй ДУХОЎНІКАЎ**.

Будучы народны мастак СССР Заір Ісакавіч Азгур — адзін з самых вядомых выпускнікоў згаданага вышэй вучылішча. А нарадзіўся ў 1908 годзе на тэрыторыі сучаснага Сенненскага раёна. Адным з яго настаўнікаў быў і Марк Шагал...

Нагадаю, што Азгур — аўтар першых помнікаў Коласу, Купале, Машэраву (усталяваны ў Віцебску. — **Аўт.**)... Яго працы можна ўбачыць і ў Астрахані, Махачкале, Ваўкавыску.

Вядома, пры дапамозе экспертаў можна будзе лёгка пацвердзіць, што на сцяне «аўтограф» менавіта Азгура.

Работы ў будынку, дзе, пачынаючы з 1918 года, размяшчаліся Вышэйшае народнае мастацкае вучылішча, Майстэрні заснавальнікаў новага мастацтва, Свабодныя мастацкія майстэрні, Віцебскі мастацка-практычны інстытут, працягваюцца.

Як раней паведамляла «Звязда», захаваўся план будынка, зроблены ў 1923 годзе.

— Наша задача — пастарацца зрабіць так, каб былы прыватны дом банкіра Ізраіля Вішняка, пабудаваны больш за 100 гадоў таму, выглядаў, як у першыя паслярэвалюцыйныя гады. Напрыклад, уваходная частка будзе выглядаць такой, як пры Шагале і іншых цяпер вядомых на ўвесь свет мастаках, — дадаў Андрэй Духоўнікаў.

Пасля завяршэння ўсіх работ будынак стане не толькі музеем, але і адукацыйным цэнтрам, месцам правядзення міжнародных канферэнцый. Дарэчы, недалёка ад яго паралельна ствараецца музей Пэна. Віцебск можа па праве ганарыцца ўнікальнай калекцыяй яго твораў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by
Фота аўтара